Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
"Гомельскі дзяржаўны універсітэт
імя Францыска Скарыны"

# Беларусь і суседзі: гістарычныя шляхі, узаемадзеянне і ўзаемаўплывы

*Матэрыялы*
*II Міжнароднай навуковай канферэнцыі*

*Гомель, 9-10 кастрычніка 2008 г.*

Гомель
УА "ГДУ імя Ф. Скарыны"
2008

Грахоцкі А. П. (г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны)

# САВЕЦКАЯ ДАВАЕННАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ РАСІЙСКАЙ УРАДАВАЙ ПАЛІТЫКІ Ў БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ

Падзеі 1917 г. прынеслі карэнныя змены ў грамадска-палітычнае, сацыяльна-эканамічнае, культурнае і духоўнае жыццё беларускага грамадства. Аднак гэтыя змены не адбываліся аднамаментна, яны праходзілі пастулова, па меры ўмацавання рэжыму бальшавіцкай улады. Станаўленне гістарычнай навукі ў БССР ішло ў надзвычай складаных умовах. Аднак, нягледзечы на гэта, ранняя беларуская гістарыяграфія здолела выйсці на навуковы ўзровень развіцця. Больш таго, савецкія улады самым непасрэдным чынам паспрыялі гэтаму. Кароткатэрміновы перыяд беларусізацыі, калі беларускія "буржуазныя" гісторыкі працавалі побач з новым пакаленнем савецкіх гісторыкаў, зрабіў магчымым прадукцыйны рост беларускай гістарыяграфіі.

Гэтак, шырокае распаўсюджванне ў БССР атрымала праца У.М. Ігнатоўскага "Кароткі нарыс гісторыі Беларусі". Упершыню выдадзеная ў 1919 г. у Вільні, кніга У. Ігнатоўскага была тройчы перавыдадзена ў Савецкай Беларусі. Чацвёртае выданне 1926 г. мела наклад 15 тыс. асобнікаў і нават выкарыстоўвалася ў якасці школьнага падтучніка [1]. На старонках кнігі аўтар, услед за У.І. Леніным, называе Расійскую імперыю "турмой народаў" [1; С.66]. У.М. Ігнатоўскі ўпершыню ў беларускай гістарыяграфіі вызначыў беларускую плыню ў паўстанні 1863 - 1864 гг. У даследаванні аўтар адзначаў, што літоўска-беларускі паўстанцкі чырвоны ўрад начале з К. Каліноўскім дамагаўся ўтварэння незалежнай Беларускай рэспублікі [1; С.169]. Пасля паўстання, па словах У.М. Ігнатоўскага, Беларусь стала "арэнай дзікай рэакцыі, безупыннай русіфікацыі і шыбеніцкай палітыкі царызму". Даследчык адзначаў і тую адмоўную ролю, якую адыграла ў беларускай гісторыі ўсталяванне расійскімі ўладамі "мяжы яўрэйскай аселасці". Аўтар пісаў, што "сілком сабраныя" ў беларускіх гарадах і мястычках яўрэйскія масы перашкаджалі міграцыі сялянства ў гарады. У выніку чаго, найбольш энэргічныя і здольныя беларускія сяляне былі вымушаныя эміграваць у іншыя рэгіёны імперыі і за яе межы [1; С.169].

У 1926 г. выйшаў курс лекцый У. Ігнатоўскага, прысвечаны падзеям гісторыі Беларусі XIX – пач. XX ст. [2]. У даследаванні аўтар замацоўвае сваю тэзу аб імкненні К. Каліноўскага стварыць "мужыцкую" Беларусь, незалежную і ад "польскага пана" і ад "рускага самаўладства" [2; С.126]. Дастаткова своеасаблівую характарыстыку У.М. Ігнатоўскі дае асобе М.М. Мураўёва: "Перад намі звычайны чыноўнік-рэакцыянер мікалаеўскай выпраўкі, каторага скарыстала аляксандраўская "эпоха вялікіх рэформ"... Мураўёўскі рэжым так заблытаў сацыяльнае, нацыянальнае і рэлігійнае

пытанне ў Беларусі, што толькі сучасная рэвалюцыя змагла падыйсці да іх і разблытаць" [2; С.144]. Асобны раздзел кнігі прысвечаны праблеме русіфікацыі Беларусі. Даследчык адзначае, што паўстанне 1863 г. выклікала шырокі ўсплеск рускага нацыяналізму і "ўра"-патрыятызму ў кансерватыўных феадальных колах імперыі. "Штандарам" расійскіх ультрапатрыётаў стаў генерал-губернатар М.М. Мураўёў, які жорстка падавіў паўстанне і вызначыў праграму русіфікацыі Беларусі. Як пісаў У.М. Ігнатоўскі, палітыка русіфікацыі, скіраваная на палякаў, польскую мову і культуру, у выніку, найбольш "ударыла" па беларускасці і беларускай культуры. "Моцная польская культура не баялася мураўёўскай прымітыўнай русіфікацыі", у той час, як беларуская культура, носьбітамі якой былі сяляне і чарнарабочыя, перажывала, "дзякуючы русіфікацыі", цяжкі крызіс і вялікі заняпад [2; С.146]. Аўтар апісаў мерапрыемствы расійскай адміністрацыі па насаджэнню ў Беларусі рускага землеўладання і рускамоўнай школы [2; С.147-152]. Дастаткова падрабязна (на дзесяці старонках) аўтар разглядзеў урадавыя мерапрыемствы на Беларусі ў часы "рэакцыі канца XIX ст." У. Ігнатоўскі адзначаў, што з 1881 г. "на Беларусі ўваскрэслі часы Мураўёва": паўсюдна шукалі "польскую інтрыгу і польскі сепаратызм", каталікоў, з былых уніятаў, гвалтоўна пераводзілі ў праваслаўе, касцёлы ў такіх прыходах перараблялі ў цэрквы, "школа ізноў пачала весці ўпартую русіфікацыю". Як яскравыя прыклады рэакцыйнага ўрадавага курсу даследчык разглядаў пытанні ўвядзення на Беларусі "мяжы яўрэйскай аселасці" (1882 г.) і "Палажэння аб земскіх начальніках" (1889 г.) [2; С.170-180].

Першыя сутыкненні паміж генерацыяй нацыянальных "буржуазных" гісторыкаў і новым пакаленнем гісторыкаў-марксістаў сталі праяўляцца ўжо з сярэдзіны 20-х гадоў XX ст. Адно з першых такіх сутыкненняў нанесла вялікую страту беларускай гістарычнай навуцы. Да канца 1925 г. М.В. Доўнар-Запольскі скончыў працу над рукапісам сваёй "Истории Белоруссии", якая магла стаць ужо трэцім у беларускай гістарыяграфіі (пасля работ В. Ластоўскага і У.М. Ігнатоўскага) агульным аглядам гісторыі Беларусі. Узімку 1925 - 1926 гг. рукапіс М. Доўнар-Запольскага патрапіў на рэцэнзію да гісторыка В. Сербенты, які адначасова займаў пасаду загадчыка аддзела друку ЦК КП(б)Б. У разгромнай рэцэнзіі В. Сербента прама адзначаў: "Кнігу нельга дазволіць друкаваць". М.В. Доўнар-Запольскі стаў адным з першых беларускіх гісторыкаў, хто быў абвінавачаны ў "нацыянал-дэмакратызме" [3; С.286-287].

"История Белоруссии" М.В. Доўнар-Запольскага ўпершыню была надрукавана толькі ў 1994 г. у скарочаным выглядзе ў перакладзе на беларускую мову. І толькі ў 2003 г. убачыў свет поўны варыянт даследавання [4]. У кнізе гісторык падаў свой адметны погляд на расійскую палітыку ў Беларусі ў другой палове XIX – пач. XX ст. Даследчык адзначаў, што паўстанне 1863 г., у якім Беларусь прыняла "весьма ограниченное участие", мела "очень роковое последствие для

белорусского национального дела": узмацніўся ўрадавы прыгнёт, мясцовая інтэлігенцыя "польскай культуры" была знішчаная, а на змену ёй прыйшла велікаруская інтэлігенцыя, якая глядзела на беларусаў як на неад'емную частку рускай народнасці [4; С.417-419]. У той жа час, М.В. Доўнар-Запольскі падаваў станоўчую ацэнку дзейнасці М.М. Мураўёва ў Беларусі. Аўтар сцвярджаў, што сацыяльна-эканамічныя мерапрыемствы М. Мураўёва ў дачыненні да беларускага сялянства (адмена часоваабавязанага становішча, змяншэнне выкупных плацяжоў, надзяленне абеззямеленых сялян зямлёй і г.д.) былі шчырымі крокамі генерал-губернатара, накіраванымі на паляпшэнне становішча сялянства ў краі. М.В. Доўнар-Запольскі пісаў, што М.М. Мураўёў выдатна разумеў адрозненне беларускай нацыі ад велікарускай "... и склонен был поддерживать белорусское крестьянство", аднак намеры генерал-губернатара былі сапсаваныя яго намеснікамі, якія баяліся беларускага сепаратызму [4; С.417]. Аўтар наступным чынам характэрызуе М.М. Мураўёва: "Он выгодно отличался от сановников и николаевской эпохи, и последующей. Он обладал обширным образованием, определённым образом мыслей, знанием дела, выполнять которое он призывался" [4; С.315]. Адыход М. Мураўёва з пасады генерал-губернатара азначаў, па словах даследчыка, перамену курса рускай палітыкі. Генерал-губернатар А.Л. Патапаў "пошёл по пути примирения с польским дворянством", "... он и его преемники заботились не столько о русификации поляков и полонизированного крупного дворянства, сколько о русификации белорусов" [4; С.319].

Пасля рэцэнзіі В. Сербенты (вясна 1926 г.), М.В. Доўнар-Запольскаму было прапанавана пакінуць Беларусь. У гэтым жа годзе даследчык пераяздждае на працу ў Маскву. Аднак, перад ад'ездам гісторык паспеў надрукаваць сваю працу "Народное хозяйство Белоруссии. 1861-1914 гг." [5]. Асобны раздзел гэтай кнігі прысвечаны "правительственной политике по землеустройству отдельных групп трудового населения" [5; С.53-56]. М.В. Доўнар-Запольскі разглядаў урадавыя мерапрыемствы ў дачыненні да старавераў, чыншавікоў, вольных людзей, панцырных баяр і аднадворцаў. Як адзначаў аўтар, сутнасць урадавай палітыкі ў дачыненні да гэтых груп насельніцтва зводзілася да паступовай іх нівеліроўкі з агульнай сялянскай масай. У выніку чаго, "разнастайныя групы працоўнага вясковага насельніцтва" да канца XIX ст. атрымалі ва ўласнасць зямлю, якая знаходзілася ў іх на ўмовах выкупу, і ўвайшлі ў агульны склад сялянства.

У 1928 г. выйшла арыгінальнае даследаванне А. Шлюбскага, прысвечанае адносінам расійскага ўрада да беларускай мовы ў XIX ст. [6]. Разгляд шырокага фактаграфічнага матэрыялу прывёў даследчыка да высновы аб тым, што пасля забароны ў 1859 г. беларускамоўнага друку лацінскім шрыфтам афіцыйных дакументаў, якія б пацвярджалі забарону беларускамоўнага кірылічнага друку, не знойдзена. Аднак, як адзначае аўтар, агульная палітыка ўрада ў адносінах да нацыянальных меншасцяў і шэраг адміністрацыйных мерапрыемстваў сведчаць, што расійскі ўрад "не

мог згадзіцца з вольным развіццём літаратур на "белорусском и малороссийском наречиях русского языка" [6; С.337].

Цэнтральнае месца ў даваеннай гістарыяграфіі праблемы заняла выдадзеная ў 1929 г. праца А. Цвікевіча "Западно-руссизм" [7]. А. Цвікевіч упершыню ў гістарыяграфіі здолеў асэнсаваць і сістэматызаваць русіфікацыйную палітыку самаўладдзя ў Беларусі. Ён паказаў выключнае месца М.М. Мураўёва ў ажыццяўленні русіфікацыі Беларусі. У сваёй працы А. Цвікевіч адлюстраваў асноўныя накірункі сацыяльна-эканамічнай, канфесійнай, адукацыйнай і каланізацыйнай палітыкі генерал-губернатара М.М. Мураўёва. Як адзначаў даследчык, прынцыповыя змены ва ўрадавай палітыцы ў Беларусі адбыліся з прыходам на пасаду генерал-губернатара А.Л. Патапава (1868-1874 гг.). А. Цвікевіч характарызаваў А. Патапава як прадстаўніка "антымураўёўскай пецярбургскай партыі", які рабіў стаўку на прымірэнне з мясцовым польскім дваранствам. Вынікам праўлення А.Л. Патапава ў краі аўтар называе злом "мураўёўскай сістэмы абрусення Беларусі". Увогуле ж, даследчык прыйшоў да высновы, што ў 70-я гг. XIX ст. расійская палітыка не цікавілася Беларуссю. Бурлівыя перамены ў сацыяльна-эканамічным жыцці імперыі, звязаныя з вынікамі буржуазных рэформаў, і моцны ўздым народніцкага руху на дзесяцігоддзе адцягнулі ўвагу расійскай улады і грамадскасці ад Беларусі. Як адзначаў аўтар, у 70-я гг. з Беларусі высылалі ўжо не палякаў-рэвалюцыянераў, а міравых пасрэднікаў, якіх абвінавачвалі ў прыхільнасці да сацыялізму. Наступныя змены палітычнага курсу расійскіх улад на Беларусі даследчык звязвае з пачаткам 80-х гг. XIX ст. Перамены ва ўрадавай палітыцы А. Цвікевіч тлумачыў экспансіяй на Беларусь расійскага капіталу. У 80-90-ыя гг. XIX ст., па словах аўтара, Беларусь пачала адыгрываць ролю калоніі Расіі. Поруч з эканамічным заваяваннем Беларусі расійскім капіталам адбывалася і руская культурная экспансія. А. Цвікевіч вызначаў сэнс нацыянальнай палітыкі Аляксандра III як барацьбу за "адзіную рускую культуру", якая павінна была расчысціць дарогу расійскаму капіталу на "ўскраінах" імперыі. Як вынік такой палітыкі, у Беларусі зноў пачынаецца "мода на Мураўёва", узмацняецца русіфікацыйная палітыка ў сферы адукацыі і асветы. Напрыканцы свайго даследавання А. Цвікевіч адзначаў узмацненне русіфікацыі Беларусі ў пачатку XX ст., калі русіфікацыйныя працэсы "... ўсё ... глыбей ахаплялі ўсе бакі беларускага жыцця" [7; С.295].

Умацаванне бальшавіцкага рэжыму да канца 20-х гг. XX ст., пераход да калектывізацыі і індустрыялізацыі, усталяванне культу асобы І. Сталіна абумовіла прынцыповыя змены ў гістарыяграфіі. Фактычнае знішчэнне беларускай гістарычнай навукі, якое пачалося з пачатку 30-х гг., праходзіла пад лозунгам барацьбы з "нацыянал-дэмакратызмам". Гэтак, у 1930 г. з'яўляюцца шэраг публікацый гісторыкаў-марксістаў, у якіх узнімалася праблема барацьбы з "нацыянал-дэмакратызмам" "на гістарычным фронце" Беларусі. У артыкуле "Положение и задачи

исторического фронта в Белоруссии" гісторык М. Югаў спраб… крытыкаваць працу гісторыка-"нацыянал-дэмакрата" А. Цвікеві… "Западно-руссизм" [8]. Аднак з тэксту "рэцэнзіі" адразу бачна, што М. Югаў не ведае зместу даследавання. Верагодна, перад напісанне… артыкула, гісторык павярхоўна прагледзеў кнігу і нават не зразумеў я… зместу. Перад М. Югавым стаяў сацыяльны заказ улад раскрытыкава… працу няўгоднага гісторыка, што ён і рабіў, не абцяжарваючы сяб… чытаннем "шкоднай" літаратуры. Для прыкладу, прывядзем цытату з артыкула: "... автор [А. Цвікевіч – А.Г.] казённокоштную, полицейско-духовную "идеологию" западноруссизма объективно превращает в идеологию мелкой буржуазии, делает её чуть ли не революционной, во всяком случае прогрессивной, идеализирует самых матёры… черносотенцев" [8; С.44]. Падобнага зместу выдаўся і артыкул С. Агурскага "Национал-демократические тенденции на историческом фронте Белоруссии" (1930 г.) [9]. Сярод шэрагу гісторыкаў-"нацдэмаў" С. Агурскі вылучаў і У.М. Ігнатоўскага. С. Агурскі абвінавачваў апошняга ў фальсіфікацыі падзей паўстання 1863-1864 гг. на Беларусі, пісаў, што высновы У. Ігнатоўскага аб адасобленным ад польскага беларускім руху ў паўстанні не адпавядаюць рэчаіснасці.

Падмацаваныя крытыкай з боку "калегаў" рэпрэсіі супраць выбітны… беларускіх гісторыкаў не прымусілі сябе доўга чакаць. Паводле сфабрыкаванай справы аб "Саюзе вызвалення Беларусі" былі арыштаваны В. Ластоўскі, А. Цвікевіч, У.І. Пічэта, Б. Эпімах-Шыпіла і інш. Па гэтай жа справе праходзіў і У.М. Ігнатоўскі, які, не вытрымаўшы допытаў, 1… лютага 1931 г. скончыў жыццё самагубствам. У 1930 г. з паліцаў кнігарняў, абанементаў бібліятэк і класных пакояў зніклі працы У.М. Ігнатоўскага, М.В. Доўнар-Запольскага, А. Цвікевіча [3; С.163,294].

У 30-я гг. перад гістарычнай навукай паўставала неабходнасць напісання гістарычных прац, якія б цалкам адпавядалі партыйным патрабаванням і марксісцка-ленінскай метадалогіі. Фактычна, працы класікаў марксізму-ленінізму, а пасля 1938 г. і "Кароткі курс" І. Сталіна, давалі адказы на ўсе галоўныя пытанні гістарычнага працэсу. Гісторыкам жа заставалася толькі падвесці фактaлагічны грунт пад высновы, зробленыя "класікамі". З пачатку 30-х гг. істотна звужаецца і перспектыва даследаванняў савецкіх гісторыкаў. У загадным парадку галоўнымі сферамі зацікаўленасці даследчыкаў станавіліся гісторыя рэвалюцыйнага руху і класавай барацьбы, гісторыя пралетарыяту і сялянства, сацыяльна-эканамічная гісторыя і гісторыя ранняга СССР [3; С.202].

Так, у 1932 г. выйшла праца Д.А. Дудкова "Аб развіцці капіталізму ў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст." [10]. У сваёй манаграфіі даследчык вызначае каланіяльны статус Беларусі ў складзе Расійскай імперыі. Д. Дудкоў падкрэсліваў, што каланіяльная палітыка царызму на Беларусі стварала шмат перашкодаў для развіцця гаспадаркі краіны, абумовіла эканамічную адсталасць Беларусі. У той жа час, аўтар імкнуўся

падкрэсліць сваю прыхільнасць да фармацыйнага падыходу ў асвятленні гісторыі краіны. Д.А. Дудкоў пісаў: "Але эканамічная адсталасць Беларусі ні ў якой ступені не гаворыць аб тым, што краіна засталася ў баку ад дарогі прамысловага капіталізму, як гэта жадалі давесці беларускія нацыянал-дэмакраты, нацыянал-шавіністы ўсіх колераў і іх падпявалы і паслугачы" [10; С.182-183].

У гэты час перад беларускімі гісторыкамі стаяла задача напісання агульнага агляду гісторыі Беларусі, які б цалкам грунтаваўся на марксісцкай метадалогіі. За вырашэнне гэтай задачы ўзяўся віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук Беларусі, дырэктар інстытута гісторыі АНБ В.К. Шчарбакоў. У планах даследчыка было напісанне "Нарыса гісторыі Беларусі" ў 2-х частках. Аднак у 1934 г. у свет выйшла толькі першая яго частка. У тым жа 1934 г. была надрукавана яшчэ адна праца В. Шчарбакова "Класавая барацьба і гістарычная навука на Беларусі", якая ўяўляла сабой агляд гістарыяграфіі па гісторыі Беларусі [11]. У гэтай кнізе гісторык падае і сваё бачанне праблем расійскай урадавай палітыкі на Беларусі. В. Шчарбакоў адзначаў, што да Кастрычніцкай рэвалюцыі Беларусь з'яўлялася калоніяй царскай Расіі, палітычна і нацыянальна прыгнечанай акраінай імперыі. Як бачна, В. К. Шчарбакоў, які ў сваёй працы рэзка крытыкаваў падыходы "нацыянал-дэмакратычных" гісторыкаў, сам прытрымліваўся фактычна тых жа ацэнак у асвятленні ўрадавай палітыкі на Беларусі. Невыпадкова ж, што "Нарыс" В. Шчарбакова ў 1937 г. быў далучаны да ліку "шкодных" прац, а сам даследчык быў расстраляны ў 1938 г. [3; С.297-298].

Увогуле ж, пастаянныя рэпрэсіі і страх гісторыкаў перад партыйнай цэнзурай (рэцэнзія гістарычнай працы, зробленая тым ці іншым партыйным дзеячам, магла мець для даследчыка самыя страшныя наступствы) абумовілі надзвычай нізкую прадуктыўнасць беларускай гістарыяграфіі. Па дадзеных, прыведзеных у працы Р. ЛіндНэра, у перыяд з 1932 па 1937 гг. у Інстытуце гісторыі БАН з 97 запланаваных прац да публікацыі дайшло толькі 10, прычым 7 з іх былі канфіскаваныя. У 1937 г. план публікацый быў выкананы толькі на 35% [3; С.213].

У 1937 г. у Ленінградзе выйшла праца расійскага гісторыка С.М. Драніцына, прысвесаная падзеям паўстання 1863-1864 гг. [12]. Гісторык ставіў за мэту свайго даследавання высветліць класавыя аснову "польскага паўстання". С. Драніцын прыйшоў да высновы, што паўстанне насіла яскрава выяўлены буржуазны характар, яго асноўнымі ўдзельнікамі былі прадстаўнікі дробнай буржуазіі горада і вёскі. Акрамя таго, даследчык кранаўся і некаторых пытанняў урадавай палітыкі падчас падаўлення паўстання. Так, С. Драніцын быў адным з першых савецкіх гісторыкаў, хто выказаў думку, што расійскія ўлады ў Паўночна-Заходнім краі, жорстка падаўляючы паўстанне, выкарыстоўвалі і сацыяльную дэмагогію ў дачыненні да сялянства, падтрымлівалі варожае стаўленне сялян да "польскіх" памешчыкаў.

Акрамя напісання гістарычных прац перад гісторыкамі паўставала задача публікацыі гістарычных крыніц, якія б дапаўнялі і ілюстравалі аўтарскія тэксты. Варта адзначыць, што да 1936 г. у савецкай гістарыяграфіі не выйшла ніводнага комплекснага зборніка крыніц па гісторыі Беларусі. Толькі ў 1936 г. выйшаў першы том "Гісторыі Беларусі ў дакументах і матэрыялах". У 1940 г. выйшаў другі том гэтага выдання пад рэдакцыяй М.М. Нікольскага і І.Ф. Лочмеля, які змяшчаў дакументы перыяду з 1772 па 1903 гг. [13]. Гэты зборнік змяшчаў вялізны комплекс дакументаў, які адлюстроўваў урадавую палітыку на Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. У асобным раздзеле зборніка змяшчаліся дакументы, прысвечаныя ўрадавым мерапрыемствам па падаўленню паўстання 1863-1864 гг.: цыркуляры і распараджэнні генерал-губернатараў У.І. Назімава і М.М. Мураўёва, дакладныя запіскі рускіх афіцэраў і чыноўнікаў. Асобны комплекс дакументаў прысвячаецца русіфікацыйнай палітыцы царызму на Беларусі. У гэтым раздзеле змяшчаліся запіскі М.М. Мураўёва да Аляксандра II, у якіх генерал-губернатар прадстаўляў цару падрабязную праграму русіфікацыі, дакументы Віленскай навучальнай акругі па распаўсюджванню на Беларусі рускамоўнай адукацыі і асветы, заканадаўчыя акты аб распаўсюджванні ў краі велікарускага землеўладання.

Аднак асноўным клопатам беларускай савецкай гістарыяграфіі ў гэты час было напісанне абагульняючай працы па гісторыі Беларусі, якая б адпавядала ўсім канонам савецкай ідэалогіі. Як ужо адзначалася, папярэднія агульныя агляды беларусай гісторыі У.М. Ігнатоўскага, М.В. Доўнар-Запольскага і нават В.К. Шчарбакова былі забароненыя. Гэтак, на пачатку 40-х гг. пад кіраўніцтвам У.І. Пічэты, які быў рэабілітаваны і ўжо з 1935 г. працаваў у Маскве, у Мінску распачалася падрыхтоўка першай марксісцкай сінтэзаванай працы па гісторыі Беларусі. Аднак работу па стварэнню кнігі перапыніла Вялікая Айчынная вайна, выдадзены першы том даследавання быў знішчаны ў час нападу нямецкіх войск [3; С.312].

Такім чынам, у савецкай гістарыяграфіі даваеннага часу яскрава вылучаюцца два перыяда. Першы перыяд 20-х гг. XX ст. быў надзвычай плённым для беларускай гістарычнай навукі. Урадавая палітыка на Беларусі ў другой палове XIX – пач. XX ст. асвятлялася з пазіцый беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі. Беларускія гісторыкі У.М. Ігнатоўскі, А. Цвікевіч, разглядалі мерапрыемствы М.М. Мураўёва на Беларусі, скіраваныя на русіфікацыю Беларусі, падкрэслівалі рэакцыйнасць ўрадавага курсу Аляксандра III, які прадугледжваў аднаўленне "мураўёўскіх" метадаў кіравання краем. У гістарыяграфіі атрымалі адлюстраванне праблемы русіфікацыйнай (У.М. Ігнатоўскі, А. Шлюбскі, А. Цвікевіч), сялянскай (М.В. Доўнар-Запольскі), сацыяльна-эканамічнай палітыкі царызму (А. Цвікевіч, М.В. Доўнар-Запольскі). У даследаванні "Западно-руссизм" А. Цвікевіч выказаў тэзу аб каланіяльным становішчы Беларусі ў складзе Расійскай імперыі. Другі перыяд, 30-х –

пач. 40-х гг., звязаны з рэпрэсіямі і ўсталяваннем культу асобы Сталіна, фактычна прывёў да знішчэння беларускай гістарыяграфіі. У гэты перыяд пад забаронай апынуліся ўсе папярэднія напрацоўкі гісторыкаў, і не выйшла ніводнай новай грунтоўнай працы, у якой надавалася б увага разгляду расійскай урадавай палітыкі на Беларусі. Пытанні каланіяльнага становішча Беларусі ў складзе Расійскай імперыі закраналіся ў працах Д.А. Дудкова, В.К. Шчарбакова. Аднак і гэтых гісторыкаў не прамінула хваля рэпрэсій. У цэлым, можна адзначыць, што ў даваенны перыд савецкая гістарыяграфія да канца не завяршыла фармаванне савецкай канцэпцыі асвятлення гісторыі Беларусі, у тым ліку і расійскай урадавай палітыкі. Яскравым сведчаннем гэтаму з'яўляецца адсутнасць у гэты перыяд комплекснага агляду гісторыі Беларусі, напісанага на асновах марксісцка-ленінскай метадалогіі.

## ЛІТАРАТУРА


1. Ігнатоўскі, У.М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / У. Ігнатоўскі. – Мн.: Беларусь, 1992. – 190 с.
2. Ігнатоўскі, У. Гісторыя Беларусі ў XIX і пачатку XX ст.: лекцыі, чытаныя студэнтам БДУ / У. Ігнатоўскі. – Менск: Дзярж. выдавецтва Беларусі, 1925. – 254 с.
3. Лінднэр, Р. Гіторыкі і ўлада: нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX – XX ст. / Р. Лінднэр. – СПб.: Неўскі прасцяг, 2003. – 540 с.
4. Довнар-Запольский, М.В. История Белоруссии / М.В. Довнар-Запольский. – Мн.: Беларусь, 2003. – 680 с.
5. Довнар-Запольский, М.В. Народное хозяйство Белоруссии. 1861-1914 гг. / М.В. Довнар-Запольский. – Мн.: Издание госплана БССР, 1926. – 206 с.
6. Шлюбскі, А. Адносіны расійскага ўраду да беларускае мовы ў XIX ст. / А. Шлюбскі // Інстытут Беларускай культуры. Запіскі аддзелау гуманітарных навук. Кніга 2. Працы клясы філялогіі / Пад агул. рэд. С. Некрашэвіча. – Мн: Інбелкульт, 1928. - Том 1. – С. 303-337.
7. Цьвікевіч, А. "Западно-руссизм": Нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. / А. Цьвікевіч. - 2-е выд. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 352 с.
8. Югов, М. Положение и задачи исторического фронта в Белоруссии / М. Югов // Историк-марксист. – 1930. – Том. 17. – С. 41-50.
9. Агурский, С. Национал-демократические тенденции на историческом фронте в Белоруссии / С. Агурский // Пролетарская революция. – 1930. - № 7-8. – С. 103-137.
10. Дудкоў, Д.А. Аб развіцці капіталізму ў Беларусі ў другой палове XIX і пач. XX ст. / Д.А. Дудкоў – Мн.: Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1932. – 204 с.

11. Шчарбакоў, В. Класавая барацьба і гістарычная навука на Беларусі: Гістарыяграфічныя нарысы / В. Шчарбакоў. – Мн.: Выдавецтва БАН, 1934. – 104 с.

12. Драницын, С.Н. Польское восстание 1863 г. и его классовая сущность / С.Н. Драницын. – Л.: Гос. социально-экономическое издательство, 1937. – 302 с.

13. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі (1772-1903 гг.) / Пад. рэд. М.М. Нікольскага, І.Ф. Лочмеля. – Мн.: Выдавецтва АН БССР, 1940. – Т. II. - 942 с.

Иванова Н. А. (г. Смоленск, СмГУ)

## ОКРЫТИЕ ПЕРВОЙ ЗЕМСКОЙ ГИМНАЗИИ В ГОРОДЕ ВЯЗЬМЕ

В середине 60-х гг. XIX века в Смоленской губернии, состоявшей из 12 уездов, при «народонаселении 1130000 человек» [11; С.18] существовало только одно среднее учебное заведение - мужская классическая гимназия, находящаяся в городе Смоленске. Открытая в 1804 г., она ко второй половине XIX века уже не могла удовлетворять возраставшие потребности общества в получении образования.

В Смоленской губернии, входившей в состав Московского учебного округа (далее МУО), непосредственное руководство над учебными заведениями Министерства народного просвещения (далее МНП) в то время осуществлял директор училищ губернии Николай Иванович Сосфенов. Прекрасно понимая явную недостаточность одного на всю губернию среднего учебного заведения, он обратился 3 декабря 1866 г. в Смоленское губернское земское собрание с просьбой об устройстве на средства земства второй гимназии. Приведенные доводы были следующими: во-первых, постоянное, начиная с 1861 года, увеличение числа желающих обучаться в Смоленской гимназии и как следствие переполненные классы (по уставу в классе должно находиться только 40 человек, тогда как число учеников доходило во втором классе гимназии до 92); во-вторых, «многочисленность учеников причиняет важное неудобство для общей успешности учения в Гимназии: в настоящее время преподаватель должен оставлять без опроса урока весьма многочисленных учеников» [1; Л.3об.]; в-третьих, «надежда на открытие от правительства дальнейших отделений в Гимназии сомнительна, и так как низшие классы Гимназии и теперь уже наполнены с избытком, то Смоленской Гимназии придется со следующего курса отказывать в приеме многим желающим» [1; Л.4-4об.]. Н. И. Сосфенов предложил устройство второй гимназии в Вязьме, учитывая выгодное географическое положение города в самом центре губернии.